Н. Ф. ГІКАЛО

# Каля падножжа Каўказскага хрыбта

Таварыша Кірава я ведаў даўно, і добра ведаў.

Вось першая сустрэча ў жніўні 1917 года на першай канферэнцыі большэвіцкіх арганізацый у г. Грозным, на Паўночным Каўказе. З празарлівасцю разумнага большэвіка-кіраўніка, які далёка бачыць наперад, ён расказвае ў сваім выступленні нам, двум — тром дзесяткам большэвікоў, аб абстаноўцы і суадносінах класавых сіл на гэтым складанейшым участку барацьбы за пролетарскую рэволюцыю, намячае тактыку і стратэгію нашых надыходзячых баёў. Я чуў пра Кірава і да гэтага, і сапраўднасць паказала, што ён не проста кіраўнік адной з невялікіх партыйных арганізацый таго часу, а буйнейшы арганізатар, вопытны кіраўнік партыі ў складанейшых многанацыянальных умовах Паўночнага Каўказа.

У далейшым у мяне было многа сустрэч з Сергеем Міронавічам, калі прыходзілася бываць ва Уладзікаўказе, дзе тав. Кіраў кіраваў тады партыйнай арганізацыяй. Яго непахісная вера ў перамогу справы партыі і рабочага класа заражала нас, работнікаў баявога ўчастка барацьбы з меншавікамі, эсэрамі, казацкай контррэволюцыяй, горскай і ісламісцкай рэакцыяй, барацьбы супроць наближаўшайся англа-французскай інтэрвенцыі. У канцы 1917 года ў г. Маздоку, у былой Тэрскай вобласці, збіраецца з'езд рабочых і працоўных — казакаў і горцаў. Наша невялікая большэвіцкая фракцыя ўзначальваецца Сергеем Міронавічам Кіравым.

Трэба было быць сведкай тых бліскучых, незабыўных выступленняў на з'ездзе тав. Кірава, каб бачыць, як ён запальваў, будзіў, клікаў на барацьбу працоўных горцаў, казакаў і рабочых. Я памятаю, як адзін сівы, стары чачэнец пасля аднаго з выступленняў Сергея Міронавіча памаладзеўшым, лёгкім поступам горца ўзбіраецца на трыбуну з'езда і сваёй адрывістай гартаннай мовай клянецца ў адданасці справе рабочага класа, совецкай уладзе. Трэба было перажываць момант, калі ўжо ў заключным пасяджэнні з'езда прамова тав. Кірава вобразна, страсна і магутна раскатваецца сярод дэлегатаў з'езда, заклікаючы да апошняй каплі крыві змагацца за рабочых, за беднату з горцаў і казакаў.



З'езд пераважнай большасцю прыняў прапановы большэвікоў. Была паслана тэлеграма Леніну, якая вітала Кастрычніцкую рэволюцыю і ўладу Советаў.

1919 год і пачатак 1920 года. Рабочыя, беднякі і сераднякі ўсёй краіны, пад кіраўніцтвам партыі Леніна, на многіх франтах змагаюцца не на жыццё, а на смерць з генеральска-памешчыцкай белагвардзейшчынай. Мы, што асталіся ў тылу дзенікінскіх банд, у гарах Каўказа, робім таксама агульную справу, вядзём партызанскую вайну. Нас — некалькі сотняў грозненскіх рабочых-нафтавікоў, хасбаскіх гарнякоў, уладзікаўказскіх рабочых у саюзе з дзесяткамі тысяч горскай бедняты, безадказна адданай справе соцыялізма.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы